■ У цэнтры дзяржаўнай палітыкі

АБАРАНЯЕМ ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

Надзвычай прафесійна, комплексна і прынцыпова ажыццяўляюць кантроль за належным узроўнем прадукцыі, тавараў і паслуг, якія мы спажываем, органы стандартызацыі краіны. «Звязда» рэгулярна расказвае пра дзейнасць гэтага фарпоста якасці жыцця. Сёння знаёмім вас з Калінкавіцкім цэнтрам стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі. З яго дырэктарам Уладзімірам Ярцам гутарыць карэспандэнт «Звязды».

Дырэктар цэнтра Уладзімір ЯРАЦ.

Вядучы інжынер Аляксандра МАНАГАРАВА праводзіць выпрабаванні па вызначэнні соляў цяжкіх металаў у харчовай прадукцыі.

Інжынер Алена ГРАФАВА занятая радыяцыйным кантролем пітной вады.

Інжынер-метролаг Мікалай РУДЗЯНОК павярае дазатары піпетачныя.

— Ведаеце, што звяртае на сябе ўвагу ў рабоце вашага цэнтра, Уладзімір Рыгоравіч? Ён адказвае за дзейнасць дзесяці раёнаў Гомельскай вобласці, сярод вашых дзелавых партнёраў такія буйныя і праслаўленыя калектывы, як Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, акцыянерныя таварыствы «Мазырсоль», «Гомельтранснафта», «Калінкавіцкі мясакамбінат» — спіс надзвычай вялікі. І ў той жа час вы актыўна працуеце з суб'ектамі гаспадарання Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Нічым іншым, як высокай рэпутацыяй цэнтра, гэты факт не растлумачыш.

— Супраць такой ацэнкі пярэчыць не буду, скажу толькі, што нашы спецыялісты шмат працуюць, каб умацоўваць рэпутацыю надзейнага партнёра. Заяўкі на правядзенне выпрабаванняў, пацвярджэнне адпаведнасці, аказанне метралагічных паслуг паступаюць з чатырох абласцей пастаянна. Каб адпавядаць сённяшняму дню, РУП «Калінкавіцкі ЦСМС» інтэнсіўна развіваецца, асвойвае новыя кірункі дзейнасці. І што, на мой погляд, важна: мы пастаянна вывучаем запатрабаванні арганізацый-заказчыкаў. Без чаго не даб'ешся разнастайнасці паслуг, павышэння іх якасці, а значыць, не паспяшаешь развіццю рэальнага сектара эканомікі рэгіёна. Па сутнасці ён, канешне, сельскагаспадарчы, але паглядзіце, колькі тут буйных прамысловых прадпрыемстваў. Акрамя тых, што вы назвалі, яшчэ РУП «Беларуснафта-Гомельаблнафтапрадукт», хлебазаводы, малочныя камбінаты і іншыя. Усе яны займаюць устойлівае становішча на ўнутраным рынку, а многія — і на знешнім, чаму трэба адпавядаць. Гэта накладвае пэўныя абавязкі і на нас. Дапамагаем сваім партнёрам дабіцца такога ўзроўню канкурэнтаздольнасці, які дазваляе адчуваць сябе ўпэўнена — і дома, і ў Еўропе.

— Як паказвае аналіз работы цэнтра, значную падтрымку арганізацыям рэгіёна аказваюць спецыялісты аддзела сертыфікацыі.

— Гэта тлумачыцца тым, што сёння прадпрыемствам недастаткова проста выконваць стандарты на выпушчаную прадукцыю. Умовай поспеху з'яўляецца ўкараненне эфектыўных сістэм менеджменту якасці, што забяспечвае ўладальніку сертыфіката неабходны ўзровень даверу на ўнутраным і міжнародным рынках і дае перавагі пры ўдзеле ў тэндарах, атрыманні субпадрадаў, дзяржзаказу.

Калі прывесці статыстыку, то спецыялістамі цэнтра ў 2016 годзе сертыфікаваны:

— 40 сістэм менеджменту якасці па СТБ ISO 9001 (унітарнае прадпрыемства «Калінкавіцкі малочны камбінат», СААТ «Белсыр», КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» і іншыя);

— 12 сістэм менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў на аснове аналізу небяспек і крытычных кантрольных кропак па СТБ 1470 (Калінкавіцкі хлебазавод, ЗАТ «Партнёр і К», ААТ «Чырвоны Мазыранін» і гэтак далей);

— 9 сістэм кіравання аховай працы па СТБ 18001 (дзяржаўнае прадпрыемства «Калінкавіцкі мэблевы камбінат», КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» і іншыя).

Вы разумееце, колькі работы стаіць за гэтымі лічбамі.

У рамках выканання мінулагодняга даручэння Прэзідэнта Беларусі быў распрацаваны і зацверджаны Комплекс мер на 2016—2020 гады па стымуляванні ўкараванення ў эканоміку краіны перадавых метадык і найноўшых міжнародных сістэм кіравання якасцю. Адным з мерапрыемстваў Комплексу мер з'яўляецца прымяненне айчыннымі прадпрыемствамі палажэнняў сучасных стандартаў і сістэм менеджменту якасці, прынятых у Рэспубліцы Беларусь у якасці дзяржаўных стандартаў, у тым ліку ўкараванне патрабаванняў новай версіі стандарту СТБ ISO 9001-2015 «Сістэмы менеджменту якасці. Патрабаванні», уведзенага ў дзеянне з 1 сакавіка 2016 года. Эксперты-аўдытары цэнтра актыўна праводзяць работу па ўкараненні новага стандарту на прадпрыемствах рэгіёна, а таксама гатовы аказаць метадычную дапамогу арганізацыям па выкананні мерапрыемстваў Комплексу мер, па пытаннях распрацоўкі і ўкаранення сістэм менеджменту.

— Зараз усё больш прадукцыі, з якой вытворцы выходзяць на рынкі, трапляе пад сферу дзеяння тэхнічных рэгламентаў Еўразійскага эканамічнага саюза (ТР ЕАЭС (ТР МС)).

— У сувязі з чым для больш поўнага і якаснага абслугоўвання арганізацый рэгіёна спецыялістамі аддзелаў сертыфікацыі і выпрабаванняў асвоены работы па правядзенні выпрабаванняў і пацвярджэнні адпаведнасці прадукцыі менавіта патрабаванням ТР ЕАЭС (ТР МС). Абодва нашы аддзелы ўнесены ў Адзіны рэестр органаў па сертыфікацыі і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў) Мытнага саюза, якія маюць на гэта права. Звяртаю ўвагу: выпрабаванні прадукцыі ў нас даюць магчымасць бесперашкоднага яе абарачэння на тэрыторыі краін-удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза без дадатковых працэдур пацвярджэння адпаведнасці.

У апошні час з'явіўся вельмі цікавы кірунак дзейнасці: спецыялісты цэнтра вядуць актыўную работу па арганізацыі разгляду праектаў міждзяржаўных стандартаў і прыцягненні ў гэты працэс максімальнай колькасці зацікаўленых прадпрыемстваў рэгіёна. Пры разглядзе праектаў міждзяржаўных стандартаў улічваем інтарэсы нацыянальнай эканомікі. Такім чынам, нашым суб'ектам гаспадарання прадстаўляецца магчымасць паўплываць на фарміраванне міждзяржаўных стандартаў.

— У ранг дзяржаўнай палітыкі ў нашай краіне ўзведзены пытанні якасці і бяспекі харчовых прадуктаў...

— У гэтым кірунку вельмі ў шырокім спектры працуе аддзел выпрабаванняў. Харчовая прадукцыя і сыравіна дасканала правяраюцца па арганалептычных, фізіка-хімічных паказчыках, на ўтрыманне соляў цяжкіх металаў, пестыцыдаў, мікатаксінаў, антыбіётыкаў, нітрафуранаў, радыенуклідаў. Рабіць гэта дазваляе сучасная матэрыяльная база. Два газавыя храматографы акрамя ўсяго іншага не прапусцяць на спажывецкі рынак фальсіфікаваную малочную прадукцыю, а вадкасны храматограф — сінтэтычныя фарбавальнікі, кансерванты, нітразаміны і гэтак далей. Для вызначэння соляў цяжкіх металаў у мінулым годзе набылі высокадакладны атамна-абсарбцыйны спектрафатометр «ContrAA700». На 2017 год запланавана набыццё аналізатара ртуці. З дапамогай сучаснага абсталявання ажыццяўляецца і радыяцыйны кантроль, які праводзяць як спецыялісты аддзела выпрабаванняў, так і пасты радыяцыйнага кантролю нашага рэгіёна.

Тут мы пераходзім да задач, якія выконвае аддзел метралогіі, — паверка, рамонт сродкаў вымярэння, атэстацыя выпрабавальнага абсталявання. Прадпрыемствы рэальнага сектара сёння актыўна асвойваюць новыя тэхналогіі, і без дакладных вымярэнняў не абыдзешся. Штогод у аддзел метралогіі набываем сучасныя рабочыя эталоны, патрэбныя для пашырэння сферы дзейнасці аддзела і мадэрнізацыі рабочых месцаў, тым больш што асвойваюцца новыя віды работ. Ужо сёлета набылі стэнд для паверкі/каліброўкі дазатараў піпетачных для дазіравання дакладных аб'ёмаў вадкасці ў лабараторыях медыцынскіх устаноў, фармацэўтычнай галіны, прамысловых прадпрыемстваў і гэтак далей. А вымяральнік хуткасці транспартных сродкаў «БІНАР» дазваляе метролагам павяраць аўтамабільныя спідометры.

Новыя патрабаванні да гэтага кірунку нашай дзейнасці змяшчае распрацаваная Дзяржстандартам РБ Канцэпцыя развіцця дзяржаўнай метралагічнай службы да 2020 года. Яе рэалізацыя забяспечыць павышэнне эфектыўнасці службы, у тым ліку ў сферы заканадаўчай метралогіі.

— Народная мудрасць сцвярджае: калі праінфармаваны, то ўзброены. Што робіцца ў гэтым кірунку?

— Варта напачатку сказаць, што ў цэнтры сфарміраваны салідны фонд тэхнічных нарматыўных прававых актаў (ТНПА), ён утрымлівае больш за 15 тысяч адзінак дакументаў — як на папяровых, так і электронных носьбітах, і ўсім гэтым багаццем могуць шырока карыстацца і карыстаюцца спецыялісты прадпрыемстваў і арганізацый рэгіёна.

Каб своечасова іх інфармаваць аб масіве дакументаў наогул і новых паступленнях у фонд, на базе цэнтра праводзім на рэгулярнай аснове семінары, круглыя сталы, дні адкрытых дзвярэй. Карысную інфармацыю размяшчаем на сваім сайце і ў мясцовым друку. Дзейнічае і прамая тэлефонная лінія з кіраўніцтвам цэнтра. У нашым арсенале — дзелавыя сустрэчы з прадстаўнікамі выканаўчай улады, падатковых інспекцый раёнаў, прадстаўнікамі рынкаў і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Вельмі вялікі, а магчыма нават галоўны аб'ём работы выконваецца пры наведванні шматлікіх арганізацый — па аказанні метадычнай дапамогі ў пытаннях пацвярджэння адпаведнасці прадукцыі і паслуг, распрацоўкі і ўкаранення сістэм менеджменту. Апошняе сёння не толькі на слыху, а павінна быць стрыжнем усёй работы ў любым працоўным калектыве. Бо ў сучасных умовах якасць тавараў і паслуг стала вырашальным фактарам канкурэнтаздольнасці як асобна ўзятага калектыву, так і эканомікі краіны.

«Свае перспектывы звязваем з развіццём новых кірункаў у рабоце, пашырэннем сферы дзейнасці, мадэрнізацыяй вытворчасці».

Такую вось ідэалогію мы нясём у калектывы і сустракаем там разуменне.

Лічым, што важна таксама распаўсюджваць вопыт перадавых калектываў, садзейнічаць шырокаму ўдзелу ў рэспубліканскіх і рэгіянальных конкурсах у галіне якасці. Зусім не выпадкова нашых прадстаўнікоў пастаянна запрашаюць у склад камісій конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» па Гомельскай вобласці — яны як ніхто іншы ведаюць моцныя і слабыя бакі прадукцыі мясцовых прадпрыемстваў. Дарэчы, з году ў год айчынная прадукцыя становіцца больш канкурэнтаздольнай па ўсіх параметрах і прыцягальнай для карыстальнікаў па сваім дызайне. Да такіх вынікаў мы ідзём разам з вытворцамі.

У пацвярджэнне скажу, што па выніках рэспубліканскага конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» 2016 года пераможцамі ў розных намінацыях сталі тавары акцыянерных таварыстваў «Беларуськабель», «Мазырсоль», «Калінкавіцкі мясакамбінат», «Чырвоны Мазыранін», «Тураўскі малочны камбінат», унітарнага прадпрыемства «Калінкавіцкі малочны камбінат», дзяржаўнага прадпрыемства «Мазырскія малочныя прадукты».

Пастаўленыя задачы рэальна вырашаць у дружным, прафесійным калектыве. Усяго адна лічба: 82% нашых спецыялістаў маюць вышэйшую адукацыю. Многія працуюць па 10, а некаторыя і па 25 гадоў. Шмат працоўных дынастый, дзеці прыходзяць на змену бацькам, што лепш за ўсё сведчыць пра пазітыўную, добразычлівую атмасферу ў калектыве. І такі калектыў заўсёды мае будучыню. Свае перспектывы мы звязваем з развіццём новых кірункаў у рабоце, пашырэннем сферы дзейнасці, мадэрнізацыяй вытворчасці.

Акцэнт будзе зроблены на выкананні мерапрыемстваў Комплексу мер на 2016—2020 гады па стымуляванні ўкараванення ў эканоміку краіны перадавых метадык і сучасных міжнародных сістэм кіравання якасцю.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Здымкі прадастаўлены цэнтрам.

УНП 400014825

■ К@нтыненты

ШАЎКОВЫМ ШЛЯХАМ

Як рэалізуецца найбуйнейшы транснацыянальны праект сучаснасці?

У Пекіне завяршаецца падрыхтоўка да майскага саміту, прысвечанаму рэалізацыі глабальнага праекта «Адзін пояс, адзін шлях». На яго з'едуцца лідары амаль трох дзясяткаў краін. Усяго ж у форуме будуць удзельнічаць прадстаўнікі 110 дзяржаў. Найбуйнейшы сусветны дыпламатычны саміт 2017 года пройдзе ў кітайскай сталіцы 14—15 мая. Чым так прывабны «Адзін пояс, адзін шлях»?

СПРАВА НА $20 ТРЛН

Старшыня КНР Сі Цзіньпін упершыню выклаў бачанне «Пояса і шляху» восенню 2013 года, прапанаваўшы міжнароднай супольнасці сумесна папрацаваць над маштабнай праграмай інфраструктурнага абнаўлення на прасторы ад Пекіна да Лісабона. Характэрна, што поясам былі названы сухапутныя напрамкі з Паднябеснай у Еўропу, а шляхам — маршруты па моры. Вядома, матывацыя Кітая заслугоўвае ўвагі. На працягу пяцітысячагадовай гісторыі Сярэдзінная дзяржава канцэнтравалася на ўнутраных справах і ўзаемадзейнічала з навакольным светам выключна па неабходнасці. Аднак за апошнія трыццаць гадоў карціна кардынальна змянілася: КНР стала «фабрыкай свету» (25% сусветнай прамысловай вытворчасці і 14% сусветнага экспарту), асноўным пакупнікам сыравінных тавараў і назапасіла найбуйнейшы ў свеце фінансавы капітал (актывы банкаўскай сістэмы Кітая дасягнулі 33 трлн долараў — удвая больш, чым у ЗША, і ў 25 разоў больш, чым у Расіі). Увесь час, пакуль адбываўся кітайскі эканамічны цуд, не спынялася самая вялікая ў гісторыі чалавецтва будоўля. Напрыклад, толькі за мінулы год інвестыцыі ў асноўны капітал у Кітаі склалі 9 трлн долараў.

Па афіцыйных звестках КНР, ініцыятыва «Пояс і шлях» (сучасны варыянт легендарнага старажытнага Шаўковага шляху) ахоплівае большую частку Еўразіі, а таксама часткова Афрыку, Акіянію, шэраг іншых сусветных макрарэгіёнаў, злучаючы краіны, якія развіваюцца, у тым ліку новыя эканомікі, і развітыя краіны. На тэрыторыі мегапраекта сканцэнтраваны багатыя запасы рэсурсаў, пражывае каля 70 працэнтаў насельніцтва планеты, а мяркуемы эканамічны маштаб ацэньваецца ў астранамічную суму — больш чым 20 трлн долараў. Зараз актыўна ідзе стварэнне двух маршрутаў: сухапутнага, у рамках якога плануецца пракласці тры транспартныя калідоры (паўночны — праз Казахстан, Расію і Беларусь, цэнтральны — праз Цэнтральную Азію і Блізкі Усход, а таксама паўднёвы — праз Паўднёва-Усходнюю і Паўднёвую Азію), і марскога — праз Паўднёва-Кітайскае мора, Індыйскі акіян, Чырвонае і Міжземнае моры.

Кітай плануе інвеставаць у краіны, якія далучацца да глабальнага праекта, 4 трлн долараў, заявіў член Пастаяннага камітэта Палітбюро і сакратарыята ЦК КПК Лю Юньшань. Паводле яго слоў, інвестыцыі будуць накіраваны на стварэнне транспартных калідораў, лагістычных цэнтраў, інфраструктурных аб'ектаў і культурных праектаў. Лю Юньшань таксама адзначыў, што ініцыятыва па стварэнні «Эканамічнага пояса Шаўковага шляху» і «Марскога Шаўковага шляху XXI стагоддзя» ў межах канцэпцыі «Адзін пояс, адзін шлях» атрымала шырокае ўхваленне многіх краін. Ініцыятыву падтрымалі больш за сотню дзяржаў, ужо падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з амаль 50 краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. Для рэалізацыі гэтага праекта КНР стварыла Фонд Шаўковага шляху, асобны Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый (капітал 100 млрд долараў, 57 краін-удзельніц), актыўна разгортваецца Новы банк развіцця БРІКС.

ДРАЙВЕР СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ

Паводле статыстыкі, якую прыводзіць «Жэньмінь жыбаа» анлайн», за першы квартал гэтага года знешнегандлёвы абарот паміж Кітаем і краінамі, якія знаходзяцца ўздоўж «Аднаго пояса, аднаго шляху», склаў больш чым 240 млрд долараў. Адметна, што гэтая заўважная лічба на 26,2% большая ў параўнанні з аналагічным перыядам летась. «Большасць людзей сочаць за інвестыцыйнымі магчымасцямі, аднак насамрэч не варта недаацэньваць значнасць гэтай глабальнай ініцыятывы для развіцця знешняга гандлю», — заявіў малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай эканомікі і палітыкі кітайскай акадэміі грамадскіх навук Ван Біцзюнь.

Паводле звестак Міністэрства камерцыі КНР, інвестыцыйнае супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ўздоўж «Аднаго пояса, аднаго шляху» ўвесь час развіваецца. У першым квартале гэтага года кітайскія прадпрыемствы павялічылі адпаведныя прамыя нефінансавыя інвестыцыі ў 43 краіны, агульны аб'ём капіталаўкладанняў такога тыпу склаў $2 млрд 950 млн. Глабальная ініцыятыва стала новай кропкай росту кітайскай і сусветнай эканомікі. «Аднаўленне сусветнай эканомікі ідзе даволі павольна. Ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях», сапраўды, адыграе важную ролю ў аднаўленні сусветнай эканомікі, фінансавай глабалізацыі, а таксама ў развіцці кожнага рэгіёна», — заявіў віцэ-старшыня Кітайскага цэнтра па міжнародным эканамічным абмене, былы намеснік міністра камерцыі КНР Вэй Цзяньго. Ён таксама адзначыў, што, пачынаючы з 2015 года, аб'ём знешняга гандлю Кітая з 65 краінамі ўздоўж «Аднаго пояса, аднаго шляху» дасягнуў $1 трлн. Характэрнымі рысамі гэтага працэсу з'яўляюцца стварэнне прамысловых паркаў, выхад прыватных кампаній на міжнародны рынак, развіццё тэкстыльнай прамысловасці, вытворчасці бытавой тэхнікі. Разам з гэтым павялічваецца ўзровень занятасці на месцах.

Рынкавы попыт толькі ў будаўніцтве інфраструктуры складае $1 трлн 120 млрд — 29% ад сусветнага рынку. На думку Вэй Цзяньго, вельмі важнымі цяпер з'яўляюцца асобныя галоўныя будаўнічыя праекты ў вытворчай, энергетычнай, транспартнай і сельскагаспадарчай сферах. «Адзін пояс, адзін шлях» падобны да лініі, якая аб'ядноўвае больш за 20 краін Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), палову дзяржаў Афрыканскага саюза (АС), а таксама Лігу арабскіх дзяржаў (ЛАД) і Еўрапейскі саюз (ЕС). У гэтых краінах шматлікія кітайскія прадпрыемствы, асабліва прыватныя, дабіліся вялікага поспеху па выхадзе на міжнародны рынак. Вэй Цзяньго таксама адзначыў, што павышэнне ўзроўню і пашырэнне сфер супрацоўніцтва дазваляюць Кітаю і краінам уздоўж «Аднаго пояса, аднаго шляху» развіваць больш шырокае ўзаемадзеянне. На фоне павольнага аднаўлення сусветнай эканомікі ад наступстваў глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу сусветнай супольнасці варта знайсці новую мадэль узаемадзеяння і стварыць новыя механізмы эканамічнага развіцця.

СТРАТЭГІЧНЫ ХАБ

«Адзін пояс, адзін шлях» на гэты момант найбольш важны ўклад Кітая ў развіццё планеты», — заявіў міністр замежных спраў КНР Ван І. Кітайская ініцыятыва можа разглядацца ў якасці спробы Пекіна ўдыхнуць новае жыццё ў працэс глабалізацыі, лічыць дырэктар Інстытута Далёкага Усходу РАН Сяргей Лузянін. Ён таксама адзначыў, што працэс развіцця класічнай амерыканскай версіі глабалізацыі 1990-х гадоў ужо спыніўся. «На сённяшні дзень ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» — гэта абнаўленне працэсу абмену таварамі, паслугамі, капіталам», — адзначыў эксперт. Лузянін нагадаў, што старшыня КНР Сі Цзіньпін падчас свайго выступлення на форуме ў Давосе ў студзені заявіў аб неабходнасці таго, каб краіны сумесна прасоўвалі глабальнае развіццё. «І працэс спалучэння Еўразійскага эканамічнага саюза і эканамічнага пояса Шаўковага шляху — гэта адзін з лакальных варыянтаў прасоўвання супрацоўніцтва, глабальнага развіцця. «Адзін пояс, адзін шлях» — гэта не толькі інфраструктурны, транспартны калідор, але ў больш шырокім кантэксце гэта і сумеснае развіццё краін, уцягнутых у гэты праект, і ў плане транспартных калідораў, і ў плане інвестыцыйнай, гуманітарнай, міжбанкаўскай і турыстычнай кааперацыі», — дадаў аналітык. Ён падкрэсліў, што на гэтым этапе «ўжо выразна праглядаюцца пяць-шэсць трэкаў у рамках гэтага кітайскага праекта».

Для Кітая і краін-удзельніц існуюць досыць сур'ёзныя праблемы, якія паўстаюць на шляху да рэалізацыі праекта — пачынаючы ад асаблівасцяў рэльефу і клімату і заканчваючы карупцыяй, лакальнымі канфліктамі і, у тым ліку, некаторай падазронасцю ў дачыненні да сапраўдных мэтаў Кітая пры рэалізацыі будаўніцтва. Велізарная колькасць лагістычных нюансаў, без уліку юрыдычных праблем і іншых падводных камянёў, робіць гэты праект надзвычай складаным задачай, і для яе вырашэння ўсе гэтыя цяжкасці і непаразуменні павінны быць паспяхова пераадолены. Як абвяшчае старажытная кітайская прыказка: «Дарога ў тысячу лі пачынаецца з першага кроку».

Прыемна, што наша дзяржава адыграе заўважную ролю ў развіцці глабальнай ініцыятывы. Гаворка ідзе не толькі пра стварэнне Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка (які, між іншым, старшыня КНР Сі Цзіньпін назваў «жамчужынай Новага Шаўковага шляху», а і пра транзітныя магчымасці ўвогуле. Як заўважыў прафесар інстытута сусветнай эканомікі і палітыкі Кітайскай акадэміі навук Сюе Лі, Кітай разглядае Беларусь як найважнейшы транспартны вузел, хаб (сухапутны порт) на шляху з Азіі ў Еўропу.

Як вядома, Прэзідэнт Беларусі прыме ўдзел у прадстаўнічым міжнародным форуме «Адзін пояс, адзін шлях». Падчас гэтага візіту запланавана двухбаковая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Сі Цзіньпінам. «Форум, у якім прыме ўдзел наш прэзідэнт, — гэта прыклад, калі збіраюцца краіны, аднадумцы, якія падзяляюць агульныя каштоўнасці, для таго каб абмеркаваць праблемы і знайсці рашэнне па выхадзе з тых цяжкасцяў, з якімі сутыкаецца сусветная супольнасць», — заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у КНР Кірыл Руды ў інтэрв'ю інфармагенцтву «Сіньхуа». Ён адзначыў, што паколькі Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні ў Еўропе і праз яе праходзяць шматлікія гандлёвыя шляхі, то наша краіна зацікаўлена ў перспектывах развіцця гэтага праекта.

«Мы разлічваем, што ў ходзе гэтага візіту прасунецца шэраг практычных кірункаў нашага супрацоўніцтва з Кітаем», — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў падчас сустрэчы са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам. Відавочна, што для нашай краіны ўдзел у рэалізацыі ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» будзе мець значны плён. І насамрэч стане тым самым «поясам дабрабыту».

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*